Г. А. Аляксеева

# ЗАКЛЮЧЭННЕ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ: ДЫНАСТЫЧНЫ АСПЕКТ

*Разглядаюцца дынастычныя прычыны заключэння Люблінскай уніі – найменш даследаваны аспект праблемы.*

Праблема падпісання Люблінскай уніі 1569 г., нягледзячы на дастатковую колькасць даследаванняў, па-ранейшаму выклікае цікавасць гісторыкаў. І калі на конт знешнепалітычнага і ўнутрыпалітычнага аспектаў яе заключэння меркаванні навукоўцаў ужо фактычна дасягнулі кампрамісу, то дынастычныя прычыны дастаткова рэдка разглядаюцца спецыялістамі. Між тым, на наш погляд, высвятленне дынастычных прычын таксама з'яўляецца важным для раскрыцця сутнасці праблемы.

Як і ў Сярэднявеччы, у пачатку эпохі Новага часу дынастычныя сувязі заставаліся адным з найбольш важных элементаў знешняй палітыкі тагачасных дзяржаў. Заключэнне шлюбаў паміж прадстаўнікамі правячых дынастый з'яўлялася інструментам стварэння ваенна-палітычных саюзаў, а таксама індыкатарам палітычных арыентацый кіраўнікоў. Такія палітычныя сімпатыі-антыпатыі манархаў традыцыйна фармаваліся пад уплывам геапалітычнага становішча краін.

Разам з тым у межах дынастычных сістэм, як правіла, выпрацоўваліся важнейшыя планы і мерапрыемствы палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё саміх дынастый, падтрымку іх легітымнасці. Пры гэтым не заўсёды шлюбныя стратэгіі манархаў мелі дзяржаўны характар, набываючы і прыватны аспект. А ў тым выпадку, калі пад скіпетрам аднаго манарха знаходзіліся некалькі дзяржаў, інтарэсы якіх супадалі далёка не заўсёды, клопаты пра лёс дынастыі часам прыходзілі ў супярэчнасці з дзяржаўнымі памкненнямі краін.

Хрыстаматыйным стала сцвярджэнне аб тым, што дынастычную прычыну заключэння Люблінскай уніі складала боязь за спыненне асабістай уніі, якая злучала Вялікае Княства Літоўскае (далей – ВКЛ) і Каралеўства Польскае, пасля смерці апошняга прадстаўніка кіруючай у абедзвюх дзяржавах дынастыі Ягелонаў Жыгімонта II Аўгуста (1520 – 1572). Жыгімонт II Аўгуст быў адзіным дажыўшым да дарослага ўзросту сынам караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога (1467 – 1548) ад другога шлюбу, заключанага ў 1518 г. з Бонай Сфорца (1494 – 1557), дачкой міланскага герцага Джан Галеаца Сфорца (1469 – 1494) і Ізабэлы Неапалітанскай (1470 – 1524). На момант падпісання Люблінскай уніі Жыгімонт II Аўгуст быў ужо жанаты ў трэці раз, але не меў дзяцей. Першай яго жонкай была Альжбета Габсбург (1526 – 1545, шлюб з 1543 г.). Маці Жыгімонта II Аўгуста, Бона, была праціўніцай заключэння гэтага шлюбу, і, на думку даследчыкаў, прыклала руку да скорай смерці хваравітай Альжбеты. Бона жадала, каб у другі раз Жыгімонт II Аўгуст ажаніўся з Ганнай Гагенцолерн, спадчынніцай Прусіі, але сын не пагадзіўся з меркаваннем маці. Другой жонкай Жыгімонта II Аўгуста стала адна з найпрыгажэйшых і адукаванейшых жанчын ВКЛ, удава магната Станіслава Гаштольда Барбара Радзівіл (1520 – 1551). Тайны шлюб з ёй быў заключаны ў 1547 г., прызнаны з 1548 г. Зноў не без удзелу Боны каханая жонка манарха пакінула свет жывых. Трэцяй жонкай Жыгімонта II Аўгуста з 1553 г. стала Кацярына Габсбург (1533 – 1572 г.) удава мантуанскага герцага, манферацкага маркграфа Францыска III Ганзага. З 1563 г. муж і жонка жылі асобна, з 1566 г. Кацярына з'ехала на радзіму. Мала хто з даследчыкаў звяртаў увагу на тое, што першая і трэцяя жонкі Жыгімонта II Аўгуста былі роднымі сёстрамі, і даводзіліся свайму мужу стрыечнымі пляменніцамі, бо з'яўляліся дочкамі Ганны Уладзіславаўны Ягелонкі і Фердынанда I Габсбурга, караля Венгрыі і Чэхіі, затым імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Такія шлюбы часта былі бяздзетнымі. І калі нават давалі нашчадкаў, то не заўсёды жыццяздольных. Такім чынам, уяўляецца натуральным імкненне Жыгімонта II Аўгуста разарваць трэці шлюб, каб, ажаніўшыся ў чацвёрты раз, забяспечыць працяг дынастыі Ягелонаў. Дазвол на развод мог даць толькі папа рымскі. Ватыкан жа разглядаў Польшчу як фарпост каталіцызму ва Усходняй Еўропе. Таму Жыгімонт II Аўгуст быў вымушаны больш прыслухоўвацца да прапаноў Польшчы, каб ператварыць дынастычную ўнію паміж краінамі ў рэальную інкарпарацыйную. Як бачым, дынастычна палітыка Ягелонаў не заўсёды супадала з дзяржаўнымі інтарэсамі ВКЛ, а факты інцэсту, якія мы маем на прыкладзе першага і трэцяга шлюбаў Жыгімонта II Аўгуста, сталі адной з прычын вымарачнасці самой дынастыі.

### *Список литературы*


1. Герберштейн, С. Записки о Московии: В 2 т./ С. Герберштейн/ под ред. А.Л. Хорошкевич. – М.: Памятники исторической мысли, 2008. – Т. 1: Латинский и немецкий тексты, русские переводы с латинского А.И. Малеина и А.В. Назаренко, с ранненововерхненемецкого А.В. Назаренко. – 776 с., ил.
2. Мікалаева, Л.В. Дынастычная палітыка Ягелонаў і знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў


Бібліятэка БДУ

канцы XV – сярэдзіне XVI ст./ Л.В. Мікалаева// Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки. Сборник научных статей. Выпуск 13. В двух частях. Часть 1. Под редакцией доктора философских наук, профессора В.Ф Беркова. – Минск: РИВШ, 2013. – С. 249 – 255.

*Алексеева Анна Александровна*, студентка Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, Anna6384540@mail.ru.

*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, доцент кафедры гуманитарных дисциплин Белорусского государственного университета, кандидат гуманитарных наук, Mikalayeva@bsuir.by .

Библиотека БГУИР